*Людміла Дучыц*

# ТРАДЫЦЫЯ ШАНАВАННЯ СВЯТОГА КАМЕНЯ Ў ВЁСЦЫ КРАМЯНЕЦ ЛАГОЙСКАГА РАЁНА МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Культавыя камяні – самыя старажытныя сведкі гісторыі і самыя першыя натхняльнікі культурнай дзейнасці чалавека. Пакланенне камяням з паглыбленнямі асабліва характэрна для народаў Прыбалтыкі і паўночна-заходняй Беларусі. Яно было звязана з культам урадлівасці, затым паглыбленні на іх сталі атаясамлівацца са слядамі Бога, Божай Маці, розных святых. З часоў сярэднявечча ім пакланяюцца і каталікі, і праваслаўныя. У Беларусі выразна акрэсліваецца спалучэнне язычаскага культу камянёў з хрысціянскімі вераваніямі. Пакланенне вясковым святыням, шанаванне свяшчэнных камянёў, крыніц, дрэў, каменных і драўляных крыжоў, капліц сучасныя даследчыкі інтэрпрэтуюць як культурныя функцыі народнага хрысціянства.

Сярод улічаных навукоўцамі камянёў-следавікоў Усходняй Еўропы і Прыбалтыкі найбольш цікавы Святы (Дажбогаў, Богаў) камень каля вёскі Крамянец Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Ён з’яўляўся дамінантай свяцілішча, якое некалі тут існавала і ўключала яшчэ каменную выбрукоўку і сакральны калодзеж, вада ў якім лічылася святой. Свяцілішча было агароджана. Мясцовыя жыхары памятаюць, што раней існавалі і веснічкі. Ля яго праводзіліся кірмашы, была ўзведзена праваслаўная каплічка, куды веруючыя клалі свае ахвяраванні.

Святы камень, шануемы мясцовым насельніцтвам у вёсцы Крамянец Лагойскага раёна Мінскай вобласці, упершыню згадваецца ў друкаваных крыніцах ураджэнцам гэтага раёна Змітраком Бядулям у газеце «Наша ніва» за 1911 год. Гэты валун з пяццю выемкамі (тры авальных і дзве круглых) у 1985 годзе быў даследаваны геолагамі Акадэміі навук. У 1986 годзе археолаг Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Эдвард Зайкоўскі правёў тут археалагічныя раскопкі, пасля чаго ў 1987 годзе валун быў узяты пад ахову дзяржавы як камень-следавік перыяду бронзавага веку. Вучоныя запісалі ад мясцовых жыхароў легенды пра паходжанне слядоў на камені (што іх пакінуў Бог або нейкі святы), пра тое, што камень нельга забіраць з таго месца, дзе ён ляжыць, бо гэта можа прынесці хваробы і няшчасці. Яны даведаліся, што каля Святого каменя ў засуху дзевяць удоў пэўным чынам здольны выклікаць дождж. У 1985 годзе былі запісаны звесткі, што валун даўней называлі не толькі Святы, а часам і Дажбогаў, Богаў камень.

Што да выкарыстання мясцовым насельніцтвам назваў «Дажбогаў», «Богаў» камень – цікавымі ўяўляюцца звесткі пра тое, што ўрочышча, дзе ляжыць Святы камень, называлася Д а л ь ж б ы (гл. «Список памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР», книга вторая. Памятники археологии. Утверждён постановлением Совета министров БССР за № 32 от 18 февраля 1988 года / Минск: «Белорусская Советская Энциклопедия» имени Петруся Бровки, 1990. С. 207, №1317), а

таксама урочышча Д а ж б о г («Справаздача аб навукова-даследчай працы «Культавыя камяні Беларусі» у двух тамах. Том 2. Базавая картатэка культавых валуноў. Праект № Г 19-028 ад 18.12.1992. Прадастаўлена для Фонда фундаментальных даследаванняў, Мінск, 1995 год).

Экспедыцыі апошніх гадоў, калі збіраліся звесткі для ўзяцця Святога каменя пад ахову дзяржавы як помніка нематэрыяльнай культурнай спадчыны, выявілі яшчэ іншыя легенды, якія ведаюць і расказваюць жыхары вёскі Крамянец. А ў жніўні 2012 года ў вёсцы назбіралася дзевяць ўдоў, што дало ім магчымасць у засуху правесці абрад выклікання дажджу. Дождж, якога не было месяцы два, пайшоў на другі дзень. Высветлілася, што жыхары вёскі Крамянец працягваюць традыцыю ушанавання сваёй святыні на каляндарныя святы, носяць да каменя дары, каб пазбавіцца ад хвароб, абракаюцца і просяць паратунку ад розных бед. Святы камень наведваюць таксама падчас сямейных урачыстасцей, стараюцца перадаваць традыцыі яго ўшанавання маладзейшым, нават тым, хто выехаў з вёскі ў горад. Яны не парываюць сувязі з радзімай, захоўваюць бацькоўскія хаты, апрацоўваюць зямлю, разумеюць каштоўнасць вясковых традыцый. Звесткі пра Святы камень у Інтэрнеце і ахоўны знак, што быў установлены ля валуна, прыцягваюць да яго ўвагу неаязычнікаў. Яны прыязджаюць да Святога каменя, каб спраўляць свае абрады, абражаючы вераванні мясцовых жыхароў. Дзеянні неаязычнікаў, вельмі небяспечныя для валуна. Таму мясцовыя жыхары просяць улады дапамагчы ім захаваць Святы камень, які з'яўляецца для іх вялікай каштоўнасцю.

Як элемент культурнай спадчыны, традыцыі шанавання Святога (Дажбогавага, Богавага) каменя ў вёсцы Крамянец Лагойскага раёна і ўвесь комплекс варты таго, каб ўзяць іх пад ахову дзяржавы і ўключыць ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. На карысць прапановы сведчыць наступнае: – жывая традыцыя наведвання месца, дзе ён ляжыць, падчас веснавых і летніх каляндарных свят з ахвяраваннем яму абрадавых страў, асабліва на Вялікдзень;

– наведванне каменя падчас сямейных урачыстасцей, у прыватнасці на другі дзень вяселля;

– лячэнне вадой з лунак, асабліва пры хваробах вачэй;

– абраканне наведваць Святы камень пэўны час або ўсё жыццё, калі лячэнне каля яго або ў справе пазбаўлення ад бяды будуць мець станоўчы вынік;

– захаванне шэрага мясцовых легенд, сюжэтаў, напрыклад, пра тое, што сляды на камені пакінуў нейкі святы ці Бог, што Святы камень нельга перавозіць у іншае месца, бо гэта прынясе хваробы, няшчасці, працяглы дождж, а то і патоп, калі ён увесь пакрыецца вадой;

– аказіянальны абрад выклікання дажджу ў засуху дзевяццю ўдовамі.

Пры ўзяцці пад ахову гэтага элемента трэба ўлічваць, што валун – толькі частка Крамянецкага свяцілішча, якое ўключае ў сябе выбрукоўку каля яго (пасля раскопак Эдварда Зайкоўскага яна парушана), а таксама калодзеж, з якога бралі ваду для лячэння ля каменя. Пляцоўка была

агарожана і мела веснічкі. Гэта той асяродак, у якім традыцыя захоўвалася стагоддзямі, таму неабходна прыняць рашэнне пра аднаўленне ўсёй пляцоўкі, яе добраўпарадкаванне і ўзяцце пад ахову разам з усімі традыцыямі, звязанымі з ушанаваннем Святога каменя.

Асяроддзе каля Святога каменя патрабуе грунтоўнага навуковага вывучэння. Каля каменя-следавіка ў 200 метрах была выяўлена курганная група з дзесяткам насыпаў, што можа мець дачыненне да Крамянецкага свяцілішча. Гара Маяк і мясцовыя могілкі разам з гэтай курганнай групай і з месцам здабычы крэйды мясцовым насельніцтва таксама прадстаўляюць цікавасць. Таму важна наладзіць комплексную навуковую экспедыцыю не толькі ў вёску Крамянец, але і ў навакольныя вёскі, бо іх жыхары таксама здаўна прыязджалі да каменя на кірмашы, прыязджаюць і цяпер, каб лячыцца і абракацца.

Комплексная экспедыцыя можа працаваць у наступных накірунках: 1) вывучэнне архіўных крыніц, звязаных з гісторыяй вёскі Крамянец і свяцілішча каля яго (папярэдняя праца); 2) геалагічнае вывучэнне валуноў у межах вёскі і ва ўрочышчах вакол яе, вывучэнне месца здабычы крэйды мясцовымі жыхарамі; 3) правядзенне археалагічных раскопак на курганнай групе з мэтай выяўлення новых помнікаў; 4) аналіз мясцовай гаворкі і мікратапанімікі; 5) вывучэнне народнай медыцыны жыхароў Крамянца і навакольных вёсак; 6) даследаванне кірмашовай традыцыі гэтага мікрарэгіёна.

Як сведчаць вынікі археалагічных раскопак і пісьмовыя крыніцы, насельніцтва Лагойскага і суседняга з ім Вілейскага раёна, якія знаходзяцца на памежжы балта-славянскага свету, да XIV стагоддзя яшчэ моцна трымалася язычніцтва. Хрысціянства ў форме каталіцызму распаўсюджвалася павольна, а з 1860 года насельніцтва прымусова далучалася да праваслаўя. Тут у XVI — XVII стагоддзях яшчэ існавалі мужчынскія імёны Дадзібог (Дадзібок), Дажбог, Хвалібог і падобныя. У канцы XIX стагоддзя ў Крамянцы дзейнічала каталіцкая мураваная капліца, і толькі значна пазней была ўзведзена невялікая драўляная капліца ля Святога каменя. Усё гэта сведчыць аб асаблівай ментальнасці крамянчан.

Захаванне Крамянецкага свяцілішча і традыцый шанавання Святога каменя мясцовымі жыхарамі, несумненна, спрыяе ўзрастанню павагі лагаўчан да ўнікальнагат куточка свайго раёна, цікавасці жыхароў Беларусі да гісторыі падобных мясцін, прыцягненню ўвагі міжнароднай супольнасці да канкрэтных праяў народнага хрысціянства ў нашай краіне.